Арганізацыйным якасцям, творчым здольнасцям сацыяльны педагог павінен навучыцца ў працэсе лекцыйных, практычных і індывідуальных заняткаў. Увесь працэс прафесійнай падрыхтоўкі ў гэтым напрамку падпарадкоўваецца галоўнай задачы -- усебаковаму ўзбраенню будучага спецыяліста тэарэтычнымі ведамі і практычнымі уменнямі пастановачнай работы, падрыхтоўцы сацыяльнага педагога да самастойнай творчай дзейнасці.

Аксючік М.І.,
канд. пед. навук,
дацэнт

## СТАНАЎЛЕННЕ ЭКАЛАГІЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

Сучасная экалагічная сітуацыя вызначаецца шэрагам крызісных з'яў у стане грамадства, асабіста ў сферах гаспадарчага выкарыстання прыродных рэсурсаў і духоўных зносін чалавека і прыроды. Для пераадолення гэтых з'яў неабходна павысіць экалагічную свядомасць насельніцтва. Станаўленне экалагічнай свядомасці адбываецца як у працэсе грамадскай экалагічнай дзейнасці, так і пад уплывам шырокай экалагічнай асветы людзей.

Экалагічная асвета (і яе састаўная частка пазашкольнае экалагічнае выхаванне) з'яўляецца адной з найважнейшых у шэрагу праблем сучаснай рэчаіснасці. Іх узаемасувязь наступная: сучасная экалагічная сітуацыя - экалагічная свядомасць - экалагічная асвета і экалагічнае выхаванне, у тым ліку і ва ўстановах культуры, якія арганізуюць вольны час і маюць магчымасць прыцягваць вялікую колькасць людзей рознага ўзросту.

Працэс станаўлення экалагічнай свядомасці насельніцтва ва ўстановах культуры, у тым ліку ў клубах, праходзіць наступныя стадыі:

-- унясенне элементаў экалагічнай прапаганды ў масавыя і групавыя формы дзейнасці клуба па экалагічнаму выхаванню;

-- фарміраванне грамадскай думкі па праблемах навакольнага асяроддзя;

-- дзейнасць наведвальнікаў клубных устаноў у аматарскіх аб'яднаннях экалагічнага накірунку.

Клубныя ўстановы ажыццяўляюць працэс экалагічнага выхавання з улікам дыферэнцыяцыі розных груп насельніцтва, зыходзячы з іх адносін да прыроды. Пры гэтым неабходна звярнуць увагу на наступныя крытэрыі выніковасці экалагічнай прапаганды, якія мы вызначылі ў працэсе даследавання:

а) выкарыстанне перш за ўсё мясцовага матэрыялу, звязанага з аховай навакольнага асяроддзя свайго рэгіёна, улік мясцовай экалагічнай сітуацыі;

б) пераважнае выкарыстанне маральна-эстэтычнага аспекту экалагічнага выхавання, які спрыяе развіццю ў насельніцтва патрэбы цесных і разнастайных зносін з прыродай, магчымасці бачыць яе прыгажосць і гармонію і ажыццяўляць любую дзейнасць у прыродзе зыходзячы з законаў гэтай прыгажосці і гармоніі.

Калачова І.І.,
аспірантка

## РОЛЯ СЯМЕЙНЫХ ЭТНАПЕДАГАГІЧНЫХ ТРАДЫЦЫЙ БЕЛАРУСАЎ У ПАВЫШЭННІ ПЕДАГАГІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БАЦЬКОЎ

Сямейныя этнапедагагічныя традыцыі -- значная частка духоўнай культуры беларускага народа. Вывучаць і развіваць іх для ўжывання ў сучаснай сям'і -- адна з задач педагагічнай практыкі бацькоў, якія заўсёды адыгрывалі значную ролю ў выхаванні дзяцей.

У традыцыйнай сям'і беларусаў бацькі з'яўляліся носьбітамі сапраўдных уяўленняў аб чалавеку, аб жыццёвых з'явах, аб дабры і зле. Яны заўсёды ведалі, як патрэбна жыць, і хацелі гэтаму навучыць сваіх дзяцей. Галоўны клопат бацькоў быў навучыць дзяцей працаваць на зямлі, карысным справам, рамяству. Лічылася: умееш працаваць, будзе і багацце, і дабрабыт. Маральныя нормы паводзін бацькі чэрпалі ў мудрых народных запаветах. Клапаціліся аб сямейным лёсе дзяцей, які часта вызначалі самі. Выходзячы замуж, дачка казала: «То воля маткі, то воля бацькі, то воля не мая».

У сучаснай сям'і ўяўленні аб шчаслівым лёсе дзяцей з'яўляюцца размытымі. Змяніліся жыццёвыя каштоўнасці, жыццёвыя ўстаноўкі, ідэалы. У моладзі адбываецца трансфармацыя ўстановак на розныя віды працоўнай дзейнасці. Добра зарабляюць і жывуць сёння не тыя, хто непасрэдна вырабляе прадукцыю, а тыя, хто займаецца збытам і перапродажам гатовых тавараў. Значнасць сямейнага жыцця як «ачага» таксама змянілася. Бацькі не заўсёды могуць быць люстэркам сямейных адносін, аўтарытэтам для дзяцей.

Народная думка сцвярджала: «Бацькі -- лепшыя настаўнікі», «Бацькоўская навука да веку помніцца». Бацькі даюць прыклады павагі да старэйшых людзей, і ў першую чаргу да сваіх бацькоў. Уплыў бабы і дзеда на дзяцей грунтаваўся на іх бясспрэчным аўтарытэце, бо гэта людзі з больш багатым жыццёвым вопытам, пачынальнікі роду, захавальнікі сямейных звычаяў. Старыя ў сям'і стваралі ўтульнасць, неслі цеплыню, дабрыню, міласэрнасць, палягчалі працу гаспадыні, дапамагалі ў хатніх справах, шмат часу праводзілі з дзецьмі.

У сучаснай сям'і ўзаемаадносіны з прадстаўнікамі старэйшага пакалення складаюцца інакш. Часта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старыя дапамагаюць сваім дзецям і матэрыяльна, і маральна. Рэдка бывае наадварот.

У традыцыйнай беларускай сям'і бацькі былі носьбітамі этнічнай культуры. Калыханкі, загадкі, дражнілкі, забаўлянкі, прыказкі, прымаўкі, лічылкі, гульні, казкі займалі значнае месца ў штодзённым жыцці дзіцяці, у яго этнізацыі. Працэс этнізацыі дзяцей і падлеткаў адбываўся ў залежнасці ад іх узросту. Вылучаюцца тры асноўныя ўзроставыя перыяды: 1) дзеці ад нараджэння да 6--7 год, 2) ад 7-мі да 14 год, 3) ад 14 да 18 год. Самым выніковым перыядам у выхаванні дзяцей лічыцца першы перыяд, які звязваецца з вялікай выхаваўчай роляй бацькоў.

У сучаснай сям'і бацькі карыстаюцца некаторымі прыёмамі народнай педагогікі беларускага народа, але ж робіцца гэта нясмела і недастаткова. Прычын тут шмат: няведанне абрадаў, звычаяў, традыцый, слабыя веды аб сямейным радаводзе, адсутнасць спецыяльнай літаратуры, грамадскага прэстыжу народнай педа-гогікі як навукі, нераспрацаванасць методык па рабоце з бацькамі.

У этнасацыялагічным даследаванні гарадской сям'і ў г.Мінску, якое было праведзена намі на працягу 1992--1994 гг. (было апытана 1098 дарослых і дзяцей), высветлілася, што найбольш каштоўнымі з'яўляюцца наступныя метады і прыёмы народнай педагогікі: навучанне дзяцей рамёствам, навыкам вядзення хатняй гаспадаркі (60,5%), асабісты бацькоўскі прыклад (59,2%), тлумачэнне, парада (56,3%), вусная народная творчасць (37,8%), заахвочванне (29%), народны этыкет (11,5%), роднае слова (10,7%), уплыў грамадскай думкі (9,5%), фізічнае пакаранне (6,3%), праца на зямлі (0,3%), рэлігія (0,1%) і інш.

Такім чынам, значную ролю ў павышэнні педагагічнай культуры бацькоў можа адыграць народная педагогіка беларускага народа. Дасканалае веданне яе запаветаў, умелае ўжыванне ў праблемы сучаснай сям'і можа стаць добрым дапаможнікам у этнізацыі дзяцей і падлеткаў.

Рагачова Л.М.,
канд. гіст. навук,
ст.выкладчык

## ВЫКАРЫСТАННЕ НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У ГУМАНІСТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ АСОБЫ

У тэорыі і практыцы выхавання адной з найбольш значных і складаных праблем выступае фарміраванне гуманістычных адносін паміж людзьмі, выхаванне гуманістычнай асобы. Гуманізацыя грамадскіх адносін у межах нашай краіны і на міждзяржаўным узроўні ўспрымаецца сёння як вядучая ўмова захавання сучаснай цывілізацыі. Прызнанне чалавека «вышэйшай каштоўнасцю», «мерай усіх рэчаў» вылучана Рымскім клубам як зыходны прынцып удасканалення сусветнага грамадства.

Традыцыйна ў літаратуры перыяд узнікнення гуманізму як цэласнай канцэпцыі светапогляду і выхавання звязваецца з эпохай Адраджэння. У той жа час неабходна адзначыць, што фарміраванне яго адбывалася не на пустым месцы, а будавалася на багатай культурнай спадчыне, выпрацаванай чалавецтвам на папярэдніх этапах свайго развіцця і замацаванай у шматлікіх народных звычаях і традыцыях, якія неслі ў сабе глыбокі гуманістычны змест.

Сфарміраваныя народам на працягу стагоддзяў мэты і задачы выхавання з'яўляліся адлюстраваннем патрабаванняў згуртавання людзей да нормаў паводзін і аблічча яго членаў. Заканамерна, што змест паняцця гуманізму на кожным гістарычным этапе мае свае асаблівасці. Насычанасць яго «чалавечнасцю» змянялася з кожнай новай ступенню ў развіцці грамадства.

Аналіз этнаграфічных і фальклорных крыніц дазваляе сцвярджаць, што ў беларускай народнай педагагічнай спадчыне склалася ўстойлівая сістэма гуманістычных традыцый выхавання, якая нягледзячы на складаныя гістарычныя ўмовы развіцця заўсёды зберагала агульначалавечыя прынцыпы дабра, справядлівасці, узаемадапамогі і інш. Даная сістэма была сугучна характару і псіхалагічным асаблівасцям беларускага народа, улічвала ўмовы яго жыцця.

Асяродкам гэтай сістэмы выступае ідэал чалавека, які з'яўляецца ўзорам гуманнасці. Зафіксаваны ў шматлікіх казках, паданнях, песнях, прымаўках, ідэальны вобраз суправаджае чалавека на працягу ўсяго жыцця, выконваючы стымулюючую ролю для яго самаўдасканалення. Асноўнымі рысамі гуманістычнага зместу асобы беларуская народная педагогіка сцвярджае павагу да чалавека, прызнанне яго права на свабоду, веру ў здольнасці кожнага, дабрыню ва ўзаемаадносінах з акружаючымі, чуласць, справядлівасць. Заклікам да выхавання гэтых якасцей прасякнуты творы беларускай народнай творчасці. Народны герой Асілак, адстойваючы свабоду чалавека, яго права на роўнасць, сцвярджае, што «усялякі чалавек сам сабе пан», што «ўсё, што даў бог, гэта на патрэбу ўсім людзям, а не толькі панам». Народ уклаў у вусны Асілка важнейшы гуманістычны прынцып узаемаадносін людзей -- жыццё ў згодзе і ўзаемадапамозе: «Еш хлеб і людзям дай. Жыві, спажывай ды людзей паважай». Як вядома, народная педагогіка -- гэта адлюстраванне нормаў і прынцыпаў жыцця этнасу. Таму з упэўненасцю можна падкрэсліць, што для менталітэту беларускага народа традыцыйна характэрны высокая талерантнасць ва ўзаемаадносінах з акружаючымі, глыбокая павага да чалавека. Гуманістычныя ідэі, закладзеныя ў нормах арганізацыі жыцця, адлюстроўваюць яшчэ адну, на наш погляд, вельмі каштоўную рысу беларускага народа -- успрыманне ім агульначалавечага маральнага закона, які абвяшчае жыццё на прынцыпах «дабрыні» вышэйшай мэтай.

Адным з важнейшых аспектаў народнай гуманістычнай традыцыі, якая ў сучасны момант выступае



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ